функционированием традиционных методов диагностики и лечения и внедрением новейших информационно-коммуникационных технологий.

**Библиографический список**


1. Электронное здравоохранение [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belcmt.by/ru/sanitation. – Дата доступа: 09.11.2020.
2. Об утверждении Концепции развития электронного здравоохранения Республики Беларусь на период до 2022 года [Электронный ресурс] : Приказ Министерства Здравоохранения Республики Беларусь, 20 марта 2018 г., № 244 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2020.
3. Абламейко, М.С., Абламейко, С.В. Правовые вопросы развития электронного здравоохранения в Республике Беларусь. – Минск : Проблемы управления, 2014. – №4. – С. 33–39.
4. Цифровая индустрия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://digital.report/kakie-problemy-v-mediczine-mozhet-reshit-avtomatizacziya-i-novoe-po/. – Дата доступа: 10.11.2020.
5. О телемедицинском консультировании в Республике Беларусь [Электронный ресурс] : Приказ Министерства Здравоохранения Республики Беларусь, 31 окт. 2017 г., № 1250 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2020.


# НЕКАТОРЫЯ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫЯ ІДЭІ Ў БЕЛАРУСІ Ў XIX СТАГОДДЗІ


**Д.А. Праневіч**
*выкладчык кафедры прававых дысцыплін*
*Мінскага філіяла ўстановы адукацыі*
*«Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі»*


У XIX ст. палітычная і прававая думка Беларусі развівалася па трох асноўных накірунках: ліберальна-буржуазнаму, кансерватыўна-манархічнаму, рэвалюцыйна-дэмакратычнаму. Упершыню прынцыпы лібералізму былі сфармуляваны англійскім эканамістам А. Смітам у 1776 г. У Беларусі ідэі лібералізму пачалі распаўсюджвацца ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. сярод выкладчыкаў і студэнтаў Віленскага ўніверсітэта, а таксама гарадскога насельніцтва. У тагачасных перыядычных выданнях (“Дзеннік віленскі”, “Тыгоднік віленскі”) крытыкаваліся царкоўнае выхаванне, цемра езуітаў, даказвалася неабходнасць вызвалення сялян, жаночай адукацыі, надання грамадзянскіх правоў яўрэям. У 1-й палове XIX ст. у Беларусі сфарміраваліся цэнтры радыкальна-ліберальнай (Дэмакратычнае грамадства) і памяркоўна-ліберальнай (Віленскае дваранскае грамадства) думкі. Актыўны ўдзел у

распаўсюджванні ліберальных ідэй прымаюць прадстаўнікі студэнцкіх таварыстваў Віленскага ўніверсітэта філаматы, філарэты, прамяністыя. Ідэі рэфармавання сістэмы сярэдняй і вышэйшай адукацыі, вырашэнне сялянскага пытання адстойвалі Я. Снядэцкі (1756 – 1830), В. Страйноўскі (1759 – 1834), М.К. Агінскі (1765 – 1833) і іншыя.

У 1857 – 1864 гг. фарміраванне ліберальнага грамадскага руху ў Беларусі актывізавалася. У 1881-1905 гг. пачалося афармленне лібералізму як палітычнай плыні і стварэнне палітычнай ліберальнай апазіцыі. Лідэры апазіцыі: У. Віткевіч, У. Мятлін, А. Аляксандраў і інш.) увайшлі ў склад партыі "Народнай свабоды". Да вясны 1906 г. у Магілеве і Пінску аформіліся яе групы. Аднак з прычыны слабасці сацыяльнай базы, адсутнасці земстваў, ВНУ і інш. ліберальныя ідэі ў Беларусі ў межрэвалюцыйны перыяд 1907-1917 гг. практычна не выказваліся.

Кансерватызм сфарміраваўся на мяжы XVIII – XIX стст. як рэакцыя на ідэі эпохі Асветніцтва. Кансерватыўная плынь у Расійскай імперыі пачала складвацца ў час першых ліберальных рэформаў Кацярыны II сярод царскіх чыноўнікаў і памешчыкаў. Кансерватызм абараняў веру супраць розуму, традыцыю супраць свабоднага пазнання, іерархію супраць роўнасці, калектыўныя каштоўнасці супраць індывідуалізму, боскія ці натуральныя законы супраць грамадскіх. Шырокая дваранская кансерватыўная апазіцыя склалася ў 1850-я-пач. 1860 г.г. у ходзе абмежавання і ажыццяўлення сялянскай рэформы 1861 г. Аднак арганізацыйна яна не аформілася. У 2-й палове 1860 –х гадоў кансерватыўнае дваранства Беларусі выступіла за захаванне рэшткаў прыгону, ліквідацыю інстытута міравых пасрэднікаў і інш., хоць выказвалася за земскую і судовую рэформы. Прадстаўнікі кансерватызму ў Беларусі выступалі за захаванне патрыярхальных адносін.Прыхільнікі кансерватыўных ідэй І. Лабажэўскі (каля 1750 – 1826), Г. Ржавускі (1791 – 1866), І. Галавінскі (1807 – 1885), К. Буйніцкі (1788 – 1878) і іншыя крытыкавалі змест канстытуцый, заснаваных на прынцыпах "натуральнага права", ставілі пад сумненне ідэі "грамадскага дагавору", прынцыпы суверэнітэту народаў і правоў чалавека. Асноватворнымі паняццямі для іх былі "гісторыя", "жыццё", "нацыя". Аднак кансерватыўная думка згаджаецца з прынцыпамі канстытуцыйнай дэмакратыі і індывідуальных правоў, з неабходнасцю асцярожных і паступовых сацыяльна-эканамічных змен. Прадстаўнікі гэтага напрамку выступалі за захаванне рэшткаў прыгону, ліквідацыю інстытута міравых пасрэднікаў і інш, хоць выказваліся за земскую і судовую рэформы. У цэлым кансерватыўныя ідэі не здолелі дастаткова ярка праявіцца ў грамадска-палітычнай думцы і руху ў пачатку XX ст. Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у грамадскай думцы Беларусі найбольш выразна акрэсліўся ў канцы 50-х гг. XIX ст.

Рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у грамадскай думцы Беларусі выразна акрэсліўся ў канцы 50-х гадоў XIX ст., калі ў Расіі пачаўся новы рэвалюцыйна-дэмакратычны этап вызваленчага руху. Яго ідэолагі А. Герцэн, М. Чарнышеўскі, М. Бакунін, М. Агараў, М. Дабралюбаў абгрунтоўвалі

неабходнасць ліквідацыі памешчыцкага землеуладання, перадачы зямлі і ўсіх срокаў вытворчасці народу і інш. Рэвалюцыйны дэмакратызм прадстаўляў сабой адзінства прынцыпаў і ідэй светапогляднага характару, сістэму палітычных каштоўнасцей, у аснове якой ляжала ідэя гістарычнага прадвызначэння працоўнага народа, тэндэнцый сялянскага сацыялізма, якія мелі пэўнае распаўсюджанне ў грамадска-палітычнай самасвядомасці насельніцтва.

Прадстаўнікамі рэвалюцыйна-дэмакратычнага напрамку былі М. Валовіч (1806 – 1833), Ф.А. Савіч (1815 – 1861), Ю. Бакшанскі (1824 – 1863). К. Каліноўскі (1838 – 1864) і інш. Яны крытыкавалі феадальна-прыгонніцкія адносіны сярэдзіны XIX ст. Глыбока раскрывалі сутнасць прыгонніцкай эксплуатацыі ва ўсіх яе формах, паказвалі выключна цяжкае становішча сялян Беларусі, асабліва дзяржаўных.

Яны марылі раздаць усю зямлю сялянам, т. як яна “ад дзядоў-прадзедаў” з’яўляецца іх уласнасцю. Былі прыхільнікамі ідэалаў сялянскага абшчыннага сацыялізму. Выступалі за адмену ў будучым грамадстве ўсіх класавых, нацыянальных і рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў. Лічылі, што чалавека патрэбна ацэньваць па яго рэальных справах і заслугах. Новае грамадства павінна быць грамадствам працоўных. Давалі глыбокую крытыку педагогікі, якая склалася ў сучасным яму грамадстве. Лічылі, што існуючы сацыяльны лад не можа забяспечыць дзецям правільнага выхавання і адукацыі. Яны адзначалі, што пануючыя класы не клапоцяцца аб адукацыі і выхаванні сялянскіх дзяцей. Выступалі супраць таго, што быццам бы толькі выбраныя здольны вучыцца і займацца навукай. Выказваліся за ўсеагульную адукацыю і выхаванне, якімі будзе займацца непасрэдна дзяржава, за тое, каб школа фарміравала ў дзяцей высокія грамадскія якасці і гуманістычныя ідэалы.

Выказваліся ў гэты час у Беларусі і марксісцка-ленінскія ідэі.

Такім чынам, у палітычнай і прававой думцы Беларусі ў XIX ст. прысутнічалі агульначалавечыя праблемы дзяржавы і права.

## ФАКТОРЫ И УСЛОВИЯ ЦИФРОВОЙ ТРАНСФОРМАЦИИ

**А.К. Савостикова**
*преподаватель кафедры конституционного права*
*юридического факультета*
*Белорусского государственного университета*

Одной из главных задач построения информационного общества является цифровизация всех процессов, происходящих в государстве. В связи с этим в последние годы все более широко применяется термин «Цифровая трансформация общества».

Следует отметить, что сам термин «цифровая трансформация» упоминается в различных публикациях, однако, целостного, общепринятого